ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
10 МАЯ
ЧАЦВЕР
№ 16 (1429)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"

## тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

### ЗАКОНЧЫЛА РАБОТУ

41-я універсітэцкая студэнцкая навуковая канферэнцыя. На факультэце радыёфізікі і электронікі працавала 24 секцыі, на якіх было заслухана 325 дакладаў.

Па выніках канферэнцыі было рэкамендавана надрукаваць рэзультаты 25 дакладаў, укараніць у вытворчасць вынікі 18 студэнцкіх навуковых даследванняў, 66 распрацовак будуць укаранёны ў вучэбны працэс кафедраў. Вялікім дасягненнем навукова-даследчай работы студэнтаў-радыёфізікаў з'яўляецца і тое, што матэрыялы 11 дакладаў утрымліваюць мяркуемыя заяўкі на вынаходніцтвы.

У час работы канферэнцыі праводзіўся IV факультэцкі конкурс навукова-тэхнічнай творчасці студэнтаў, на якім дэманстраваліся 16 экспанатаў. Першай прэміі ўдастоена прылада для даследвання прастораваг размеркавання выпраменьвання паўправадніковых лазераў, распрацаваная студэнцкай навукова-даследчай лабараторыяй кафедры квантавай радыёфізікі пад кіраўніцтвам дацэнта І. С. Манака. Зараз прылада экспаніруецца на ВДНГ СССР.

**В. МАЛАФЕЕЎ,**
**сакратар савета па НДРС факультэта радыёфізікі і электронікі.**

### САВЕТ

універсітэта на чарговым пасяджэнні абмеркаваў работу савета кафедр грамадскіх навук. З дакладам выступіла намеснік старшыні савета прафесар І. І. Жбанкова.

Разгледжана таксама пытанне аб ходзе падрыхтоўкі зводнага студэнцкага будаўнічага атрада універсітэта да працоўнага семестра і некаторыя арганізацыйныя пытанні.

**З. АЛЯКСАНДРАВА.**

### З СЯБРОЎСКІМ ВІЗІТАМ

у госці да ўдзельнікаў універсітэцкай мастацкай самадзейнасці прыехаў фальклорны ансамбль Сафійскага універсітэта імя К. Ахрыдскага. Балгары выступілі з канцэртнай праграмай у Міжнародным маладзёжным цэнтры «Юнацтва». Сумесна з фальклорна-этнаграфічным ансамблем нашага універстэта «Неруш» госці правялі фальклорны вечар у студэнцкім кафэ «Гаўдэамус».

Надоўга запомняцца сафійскім сябрам паездка ў Хатынь, наведванне шклозавода «Бярозаўка», што ў Гродзенскай вобласці, экскурсія ў Музей Вялікай Айчыннай вайны і іншыя мерапрыемствы.

**В. БАБЕЙ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

## ВЯЛІКАЕ СВЯТА ПЕРАМОГІ

ЛЕТАПІС нашай краіны багаты падзеямі, якія пакінулі глыбокі след у яе гісторыі. Да іх ліку адносіцца і Вялікая Айчынная вайна. І чым далей у мінулае адыходзяць вогненныя ваенныя гады, тым больш яскрава паўстаюць яны ў памяці народнай, тым больш відавочнай становіцца іх гістарычная значнасць, веліч здзейсненага подзвігу адважных воінаў, партызан, падпольшчыкаў.

1418 дней і начэй працягвалася жорсткая бітва савецкіх людзей з германскім фашызмам — самай крывавай ударнай сілай імперыялізму. Авеяныя ленінскім сцягам, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі савецкі народ, яго слаўныя Узброеныя Сілы ў жорсткіх баях адстаялі гонар, свабоду і незалежнасць нашай Радзімы, выратавалі свет ад фашысцкага рабства.

З першага і да апошняга дня Вялікай Айчыннай вайны вядучай сілай, якая арганізоўвала і натхняла ўвась савецкі народ на гераічную барацьбу супраць фашысцкіх захопнікаў з'яўлялася Камуністычная партыя, а камуністы сваім прыкладам згуртоўвалі воінаў, умацоўвалі іх рады, вялі на подзвіг у імя перамогі над ворагам.

Гісторыя войнаў яшчэ не ведала такой самаадданасці і масавага гераізму, якія праяўлялі савецкія воіны. За подзвігі на франтах 11603 воіны былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Ордэнамі і медалямі ўзнагароджана больш за 7 млн. чалавек, 10900 баявых ордэнаў было ўручана злучэнням, часцям і караблям Савецкіх Узброеных Сіл, якія вызначыліся ў баявых дзеяннях супраць акупантаў.

Неацэнны ўклад у разгром ворага ўнеслі савецкія жанчыны. Больш за 800 тысяч патрыётак у той час неслі службу ў Савецкіх Узброеных Сілах. За баявыя подзвігі 150 тысяч з іх былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, 86 сталі Героямі Савецкага Саюза, а чатыры жанчыны-патрыёткі за мужнасць і гераізм былі ўдастоены ордэнаў Славы трох ступеней.

Савецкія людзі ажыццявілі многія патрыятычныя пачыны па аказанню дапамогі фронту. Усё насельніцтва краіны актыўна падпісвалася на дзяржаўныя займы, збірала і адпраўляла на фронт цёплае адзенне, бялізну і абутак. На добраахвотных пачатках будаваліся і перадаваліся фронту тысячы самалётаў, танкаў, падводных лодак і шмат іншай баявой тэхнікі.

Галоўным мэтам і задачам нашай краіны ў гады Вялікай Айчыннай вайны адпавядалі партызанская ўзброеная барацьба і дзейнасць партыйнага падполля на савецкай тэрыторыі, часова акупіраванай ворагам. За гады вайны ў партызанскай барацьбе супраць ворага ўдзельнічала звыш 1,1 млн. чалавек. Дзесятую частку партызан склалі жанчыны, большасць — моладзь.

Актыўны ўдзел у барацьбе з ворагам прымалі працоўныя нашай рэспублікі. Разам з




сынамі і дочкамі ўсіх савецкіх народаў у радах Савецкіх Узброеных Сіл змагаліся звыш 1100 тысяч воінаў-беларусаў і ураджэнцаў Беларусі. За мужнасць і гераізм у барацьбе з фашыстамі звыш 300 тысяч салдат і афіцэраў — нашых землякоў — узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Каля 400 воінаў удастоены звання Героя Савецкага Саюза, звыш 60 чалавек сталі кавалерамі ордэна Славы трох ступеней. Лётчыку П. Я. Галавачову, камандзірам танкавых злучэнняў І. І. Гусакоўскаму, С. Ф. Шутаву, І. І. Якубоўскаму званне Героя Савецкага Саюза было прысвоена двойчы.

Сур'ёзным укладам у Перамогу з'явілася ўсенародная барацьба супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Беларусі. На яе тэрыторыі ў гады вайны актыўна дзейнічала 213 партызанскіх брыгад і 258 атрадаў. У радах партызан налічвалася 374 тысячы чалавек, у населеных пунктах барацьбу з нямецка-фашысцкімі акупантамі вялі больш за 70 тысяч падпольшчыкаў. Сярод народных мсціўцаў Беларусі мужна змагаліся сыны і дочкі больш як 70 нацыянальнасцей нашай краіны.

За тры гады гераічнай барацьбы ў тыле ворага народныя мсціўцы Беларусі забілі і паранілі больш за 500 тысяч варожых салдат і афіцэраў, пусцілі пад адхон звыш 11 тысяч эшалонаў, падарвалі звыш 18 тысяч аўтамашын, 1355 танкаў і бронемашын, 305 самалётаў і шмат іншай баявой тэхнікі.

Актыўны ўдзел у барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі прымалі выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты БДУ імя У. І. Леніна. Дваім з іх, М. П. Катлаўцу і У. А. Парахневічу, за баявыя заслугі прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

39 памятных гадоў прайшло з таго часу. Але гераічныя подзвігі, здзейсненыя сынамі і дочкамі нашай Радзімы ў цяжкія гады Вялікай Айчыннай, назаўсёды застануцца ў памяці савецкага народа. Савецкія людзі свята захоўваюць памяць тых, хто змагаўся і загінуў, змагаўся і выжыў, хто ахвяраваў сваім жыццём дзеля будучых пакаленняў.

Мы ганарымся, што ў калектыве нашага універсітэта працуюць 305 удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і сярод іх Героі Савецкага Саюза доктар гістарычных навук, прафесар Д. П. Жмуроўскі, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт М. Я. Зайцаў, што разам з намі жыве і радуецца нашым поспехам Герой Савецкага Саюза, генерал-маёр у адстаўцы, ветэран Камуністычнай партыі, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў А. В. Кірсанаў — ганаровы грамадзянін Брагіна, Калінкавіч і Чарнігава. Сярод выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта — кавалеры ордэна Славы III ступені С. Х. Александровіч, П. Р. Бароўскі, С. М. Грабчыкаў, А. А. Лабуда, У. У. Стэцко, П. П. Шуба і іншыя. Многія ветэраны маюць іншыя ўрадавыя ўзнагароды. Усе яны актыўна ўдзельнічаюць у ваенна-патрыятычным выхаванні студэнцкай моладзі.

Адзначаючы слаўную 39-ю гадавіну Перамогі, савецкі народ не забывае, што сёння абстаноўка ў свеце напружаная, і крыніцай яе напружанасці з'яўляюцца авантурысцкія дзеянні агрэсіўных сіл імперыялізму начале з ЗША. У гэтых умовах Савецкі Саюз робіць усё магчымае, каб захаваць і ўмацаваць мір, каб зберагчы чалавецтва ад пагрозы ядзернай вайны.

Усімі сваімі поспехамі ў мірнай працы савецкія людзі абавязаны Камуністычнай партыі, якая праяўляе пастаянны клопат аб умацаванні эканамічнай і абароннай магутнасці сацыялістычнай Радзімы. «Цэнтральны Камітэт партыі і Савецкі ўрад разумеюць высокую адказнасць перад народам,— заявіў Генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР К. У. Чарненка на сустрэчы з рабочымі маскоўскага завода «Серп і молат».— Чэрвень 1941 года не паўторыцца. Любога агрэсара напаткае неадкладная адплата. Няхай гэта ведаюць усе — і нашы сябры, і нашы ворагі».

**І. МАРЧАНКА,**
**член партыйнага камітэта універсітэта, старшыня савета ветэранаў вайны, дацэнт.**

● АГЛЯД-КОНКУРС ●

## ВІНШУЕМ З ПОСПЕХАМ

ПРАВЕДЗЕНЫ традыцыйны універсітэцкі агляд-конкурс сродкаў нагляднай агітацыі і прапаганды на факультэтах. Члены камісіі аднадушна выказалі свае задавальненні пазітыўнымі зменамі ў стане нагляднай агітацыі на большасці факультэтаў з часу лютаўскага агляду.

Кіраўніцтва большасці факультэтаў правільна зразумела крытыку, станоўча аднеслася да вывадаў мінулага рэйду і на сённяшні дзень ліквідавала недахопы ў нагляднай агітацыі.

Улічваючы актуальнасць матэрыялаў, іх ідэйную накіраванасць, аператыўнасць, жанравую разнастайнасць, эстэтычныя патрабаванні і кампаноўку, камісія вызначыла месцы сярод факультэтаў наступным чынам: 1—2 падзялілі паміж сабой фізічны і юрыдычны факультэты, 3—4 — факультэты журналістыкі і радыёфізікі і электронікі, 5 — біялагічны, 6—7 — хімічны і гістарычны, 8 — механіка-матэматычны, 9 — ФПМ, 10 — геаграфічны, 11 — філалагічны.

Асобна падведзены вынікі конкурсу факультэцкіх насценнак. Месцы паміж імі размеркаваліся наступным чынам: 1 — «Журналіст» (журфак), 2 — «Vita» (біяфак), 3—5 — «Імпульс» (факультэт радыёфізікі і электронікі), «За навуку» (фізфак), «Гісторык» (гістфак), 6 — «Хімік» (хімфак), 7 — «Слова філолага» (філфак), 8—9 — «Алгарытм» (ФПМ), «Савецкі юрыст» (юрфак), 10—11 — «Мерыдыян» і «Рошым любую задачу» (стэнды геафакаўскай і мехматаўскай насценгазет у дзень праверкі пуставалі).

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
**наш кар.**

# ВАЙНА. ЛЮДЗІ.

● ВЕТЭРАНЫ Ў СТРАІ ●

## У ПЕРШЫХ РАДАХ

**ЦІШЫНЮ разрываюць гучныя раскаты. Людзі з заміраннем у сэрцы, шырока адкрытымі вачамі глядзяць у неба. Але не трывога, не боязь у гэтых вачах. Праходзіць імгненне, і ў небе расцвітаюць цудоўныя кветкі святочнага салюта. Так ужо павялося, што ў Дзень Перамогі, 9 мая, на усёй савецкай зямлі ўзлятаюць у неба залпы пераможнага салюта. Мільёны савецкіх людзей накіроўваюць свае погляды ў мірнае неба. За яго чысціню 25 гадоў свайго жыцця аддаў Аляксей Еўдакімавіч Сімакоў.**

САРАКАВЫЯ — ракавыя. Закружылі над савецкай зямлёй самалёты з чорнымі крыжамі, выпускаючы з сябе смертаносныя грузы.

— Першыя дні вайны — самыя цяжкія дні. Было вельмі страшна, людзі не ведалі, куды хавацца,— разказвае Алексей Еўдакімавіч.— Напаўшы знянацку, фашысцкая авіяцыя наносіла моцныя ўдары і па аэрадромах. У няроўных баях стойка змагаліся савецкія лётчыкі. Вялікія страты нёс і наш полк. Але часцей і часцей сталі з'яўляцца ў небе бамбардзіроўшчыкі з чырвонымі зоркамі.

Сярод тых, хто рыхтаваў самалёты да палётаў, хто набліжаў вялікае свята Перамогі быў і інжынер Сімакоў. Пасля вайны Аляксей Еўдакімавіч служыў у групе савецкіх войск у Германіі, на Далёкім Усходзе — усюды беражліва сцярог цішыню і спакой савецкіх людзей.

Радзіма высока ацаніла баявыя заслугі А. Е. Сімакова. Ордэны Айчыннай вайны другой ступені, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, шмат медалёў блішчаць сёння на грудзях ветэрана. Зараз Аляксей Еўдакімавіч — інжынер на кафедры радыёфізікі. Як і раней ён стаіць у першых радах барацьбітоў за мір.

**М. САКАЛОЎ,**
**студэнт факультэта радыёфізікі і электронікі.**

**Сяргей ЧЫГРЫН,**
**студэнт філфака**

**НЕЙТРОННАЯ БОМБА**

Чалавек —
Вышыня,
Мір яму даспадобы...
Рыхтуй, цішыня,
Краты для бомбы.
Цярпець даволі
Новую пробу,
За шчасце і волю
Знішчым бомбу.

**ПОМНІК САВЕЦКАМУ ВОІНУ Ў БЕРЛІНЕ**

Памяць далёкія гады
Губляе,
Калосіцца жыццё ў вяках...
А мне здаецца:
Ён мужна трымае
Дачку Хатыні
На руках.

**ЛЁСЫ ЛЮДСКІЯ... Якія яны розныя. Нічым не падобныя адзін на другі. Але ў гісторыі бываюць такія моманты, калі гэтыя лёсы становяцца аднолькавымі. Аднолькавымі з лёсам свай Радзімы, калі яе межы пераступае варожая нага. Па-рознаму складвалася і жыццё гэтых людзей. Кожны з іх займаўся мірнай стваральнай працай. Але настаў сорак першы год...**

## РАНІЦА ДВУХ ДЗЁН І ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

**Прафесар Рыгор Лазаравіч СТАРОБІНЕЦ — загадчык кафедры аналітычнай хіміі:**

**22 ЧЭРВЕНЯ 1941 ГОДА.**

**— Была цёплая раніца выхаднога дня. Раніца надзей, мар, планаў, добрага настрою. Раніца, поўная шчасця і мірнай цішыні. Я выйшаў пагуляць з шасцігадовым сынам па гораду. Мы доўга хадзілі. Сэрца маё радавалася шчаслівым усмешкам сына. Мы гулялі, калі па зямлі ўжо грукатала вайна. Ужо ўступілі ў смяротную схватку з ворагам абаронцы Брэсцкай крэпасці, сярод якіх быў і мой брат — палітрук заставы. Пазней мы даведаліся, што сем'і пагранічнікаў эвакуіраваліся на ўсход. А самі пагранічнікі засталіся. Засталіся, каб цаной свайго жыцця даказаць усяму свету, што савецкі народ перамагчы нельга.**

Сівы прафесар закрыў вочы рукой. Нялёгка ўспамінаць яму аб гэтых страшных днях, аб смерці брата. І ніколі не зможа забыцца аб іх, таму што гэта частка яго жыцця, частка жыцця яго пакалення.

**— Вайна... Памерклі фарбы раніцы. Стала цёмна-цёмна ў вачах, пайшла кругам галава. Гэта быў нейкі шокавы стан. Потым, калі больш стаў усведамляць сэнс усяго таго, што здарылася, анямеласць пачала адыходзіць, а цемра так і засталася, засталася да пераможных дзён.**

**На наступны дзень прыйшоў на работу. Быў створаны атрад самаабароны. Жанчыны станавіліся медсёстрамі, а мы — байцамі. На стрэхах устанаўлівалі кулямёты. Трэба было абараняцца — над горадам закружылі самалёты з чорнымі крыжамі.**

**...Потым стаў байцом хімічнага ўзвода дзесятай гвардзейскай арміі, якая ўваходзіла ў склад Трэцяга Беларускага фронту. Не хапала людзей, і таму нас часта кідалі на баявыя аперацыі. Каб з'явіцца нечакана, мы рухаліся ў асноўным ноччу. Людзі не ведалі сну. Але ніхто і ніколі не скардзіўся. Гэта былі савецкія людзі.**

**9 МАЯ 1945 ГОДА.**

**— Раніцу гэтага дня мы сустрэлі на тэрыторыі Польшчы. Нас пастроілі і аб'явілі аб безагаворачнай капітуляцыі Германіі. Якая гэта была радасць! Мы кінуліся адзін да аднаго, пачалі цалавацца. Залпы салюта палялі ўжо ў мірнае неба...**

**Прафесар Мікалай Тарасавіч РАМАНОЎСКІ — загадчык кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін:**

**22 ЧЭРВЕНЯ 1941 ГОДА.**

**— Здарылася так, што пра пачатак вайны я даведаўся не адразу. 22 чэрвеня 1941 года ў Мінску быў дзень адкрыцця Камсамольскага возера. Моладзь усяго горада з нецярпеннем чакала гэтага дня. У будаўніцтве прымалі ўдзел студэнты усіх ВНУ, у тым ліку і студэнты БДУ імя У. І. Леніна. Адкрыццё возера павінна было стаць для іх сапраўдным святам. У нядзелю з раніцы моладзь пачала збірацца ля возера. Там быў і я, тады яшчэ аспірант геаграфічнага факультэта. Радыёкропкі на возеры не было. Толькі на наступны дзень я даведаўся, што пачалася вайна. Ужо бамбілі Мінск. Студэнты, супрацоўнікі універсітэта сабраліся ў галоўным корпусе. У 17 гадзін адбыўся партыйны сход.**

**Пачатак вайны адчуваўся ва ўсім. Горад гарэў. Пачалася мабілізацыя. Студэнты разносілі павесткі.**

**У сакавіку 1942 года я пайшоў у партызанскі атрад. З сакавіка сорак трэцяга — кіраваў падпольнай групай у Мінску, якая дзейнічала да самага яго вызвалення. Пасля вызвалення горада я пачаў працаваць дырэктарам статыстычнага тэхнікума. Свайго памяшкання ў нас не было. Горад быў разбураны. Мы арандавалі школу.**

**9 МАЯ 1945 ГОДА.**

**— Дзень Перамогі запомніўся на ўсё жыццё. 9 мая мы даведаліся, што Германія капітуліравала. Скончылася вайна. Ніякіх спецыяльных аб'яў не было, але ўсе жыхары горада выйшлі на вуліцы. Многія прыйшлі на месца сваёй работы, вучобы. Калі я прыйшоў у тэхнікум, там ужо сабраліся нашы супрацоўнікі, настаўнікі, вучні. Усе твары свяціліся радасцю: у кожнай сям'і нехта ваяваў. Не, у гэты дзень мы не праводзілі ніякіх спецыяльных мерапрыемстваў. Але які гэта быў радасны дзень!**

**Матэрыялы да друку падрыхтавалі Н. ТАРАСАВА і І. МЕНДЗЕЛЕВА, студэнткі факультэта журналістыкі.**

## У ПАДАРУНАК — 39 МІРНЫХ ВЁСНАЎ

**Ветэраны Вялікай Айчыннай... Мы павінны, мы абавязаны зноў і зноў успамінаць аб тым, што зрабілі яны для нас, пакаленне саракавых гадоў. Мы павінны памятаць пра тых, хто падараваў нам 39 вёснаў з блакітным небам...**



КАЛІ ПРЫЙШОЎ фатаграфаваць Ларысу Лявонцьеўну Кароткую, выкладчыцу рускай літаратуры, то зусім выпадкова стаў сведкам уручэння ёй ганаровага знака Савецкага камітэта ветэранаў вайны. Яна нават падумала, што мы дамовіліся з Іванам Васільевічам Марчанка, старшынёй савета ветэранаў універсітэта, зірнула на яго запытальна.

А Іван Васільевіч радасна прыўзняўся:

— Вось добра, што вы прыйшлі. Гэта ж такая заслужаная, паважаная жанчына. Але пра сябе і слова не скажа.

Не скажа пра сябе слова... Ці добра гэта? Дзе тая мяжа паміж пахвальбой, калі слухачы перастаюць верыць табе, і маўклівасцю, калі ніхто так і не даведаецца аб здзейсненым, перажытым табой? Ларыса Лявонцьеўна адносіцца да катэгорыі маўклівых. Не, яна ўмее цікава і хораша расказваць. Так цікава, што слухаеш з асалодай. Яна ўмее расказваць, але толькі... не пра сябе. І ўжо потым, ад сяброў, знаёмых даведваешся, што з 1941 года да кастрычніка 1942 яна была кіраўніком камсамольска-маладзёжнага падполля ў Астрашыцкім гарадку, з кастрычніка сорак другога да сакавіка 1943 — сувязная брыгады «Штурмавая», а з сакавіка сорак трэцяга — баец партызанскага атрада. Спачатку кулямётчыца, потым узначаліла конную разведку. І ўсё змагла, вынесла гэта маленькая, хударлявая жанчына. Даведваешся ад знаёмых і аб тым, што Ларыса Лявонцьеўна ўзнагароджана шматлікімі медалямі за ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне, а ўжо ў пасляваенны час — медалём «За доблесную працу». І вось цяпер зноў — знак Савецкага камітэта ветэранаў. За мужнасць у час вайны, за самаадданую працу ў мірны час...

КАЛІ ГАВАРЫЦЬ пра Уладзіміра Антонавіча Навіцкага, кандыдата геаграфічных навук, дацэнта кафедры педагогікі і методыкі выкладання грамадскіх навук ІПК, то сказаць пра яго перш за ўсё патрэбна як пра лектара-прапагандыста. За саракадвухгадовы лекцыйны стаж ён прачытаў каля чатырох тысяч лекцый, якія праслухалі больш за паўмільёна чалавек.

Лекцыі... Куды яны толькі ні прыводзілі Уладзіміра Антонавіча. Ва ўсе абласныя і раённыя гарады рэспублікі, у большасць гарадоў краіны, Чэхаславакію, Балгарыю, Польшчу, ГДР, Бельгію, Мексіку... Здаецца, пакажы пальцам любую кропку на карце і Уладзімір Антонавіч пачне расказваць:

— Прыехаў сюды позняй восенню...

За сваё лектарскае майстэрства У. А. Навіцкі атрымаў званне лаўрэата медалі імя С. В. Вавілава. А пачыналася яго лектарская біяграфія ў эвакашпіталі ў блакіраваным Ленінградзе. Цяжка было тады параненым. Валодзю выклікаў да сябе камісар шпіталя. Варочаючы рукамі колы, ён пад'ехаў. Камісар гаварыў коратка:

— Ты ў нас чалавек адукаваны —тры курсы геафака закончыў. Чытай газеты і расказвай пра ўсё параненым. Праводзь гутаркі аб усім, што можа іх зацікавіць і падбадзёрыць.

Валодзю было што расказаць таварышам: за плячыма ў яго — удзел у барацьбе з белафінамі, абарона Ленінграда, за што ён атрымаў ордэн Айчыннай вайны II ступені. Так і стаў Уладзімір Антонавіч з лёгкай рукі камісара лектарам-прапагандыстам...

СТАЛАСЦЬ і маладосць, жыццёвы вопыт і дзяцінства. Добра, калі ўсё гэта аб'ядноўваецца агульным інтарэсам. Тады цікава быць разам і дзядулю, і ўнукам. Здаеццам, нам удалося перадаць на здымку гэту агульнасць інтарэсаў былога танкіста, а сёння — супрацоўніка універсітэта Міхаіла Мікалаевіча Шарыя і яго ўнукаў. Міхаіл Мікалаевіч з першага да апошняга дня — удзельнік Вялікай Айчыннай. Ён узнагароджаны шасцю баявымі ордэнамі і семнаццацю медалямі. Яму ёсць аб чым расказаць унукам, ёсць каму перадаць эстафету мірных вёснаў.

**С. ПЛЫТКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

# ПЕРАМОГА

● РЭХА МІНУЛАГА ●

## ДОЎГІЯ ДАРОГІ ВАЙНЫ

**Гавораць, што час — самы лепшы лекар. Ён загоіць раны ветэранаў, зарастуць акопы на палях былых баёў, адродзіцца зямля. Але памяць, памяць людская непадуладна часу. Яна зноў і зноў вяртае нас у тыя суровыя гады.**

**Сёння успамінамі аб Вялікай Айчыннай вайне дзеліцца Міхаіл Кірылавіч ГАРБАЧОЎ, дацэнт падрыхтоўчага факультэта.**

**— Міхаіл Кірылавіч, ці лічыце Вы, што на вайне бываюць лёгкія дарогі! Дзе Вам даводзілася пераадольваць найбольш цяжкія перашкоды!**

— На вайне не было лёгкіх дарог. Сярод самых цяжкіх дзён і начэй на ўсё жыццё засталіся ў памяці бязлітасныя баі ля сцен Сталінграда. Тут у 1942 годзе Гітлерам была сканцэнтравана значная частка ваеннага арсеналу Германіі: больш за 1 млн. салдат, 3 тысячы танкаў, 2 тысячы самалётаў, 1 італьянская і 2 румынскія арміі. Былі дні, калі па восем гадзін бесперапынна ішлі хваля за хваляй нямецкія самалёты, раўлі сірэны, рушыліся дамы. Цэлымі днямі стаялі клубы дыму і пылу. Здаралася, што немцы атакавалі па 23 разы на дзень. З разбітай немцамі базы нафта выцекла ў Волгу і загарэлася. Здавалася, гарыць сама Волга.

**— Гледзячы на такія зверствы, выпрабаваўшы на сабе неймерныя цяжкасці, як было не ўпасці духам! Але Вы выстаялі, вытрымалі, перамаглі...**

— Гітлераўцы лічылі, што чалавек не можа вытрымаць такога напружання. Мы не заўважалі ні ночы, ні дня. Але мы не бачылі людзей з адбіткам смутку на тварах, хаця і былі хвіліны, калі ўпасці духам маглі самыя моцныя. Але гэтага не здаралася. Нашы салдаты не страцілі ўлады над сваімі сэрцамі. Мы верылі ў нашу перамогу. Але да перамогі было яшчэ далёка. Мы ведалі, як пахне порах і кроў. Разумелі, як нядарэчна смерць і якое цудоўнае жыццё.

**— Зараз уся наша рэспубліка рыхтуецца да знамянальнага дня — 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Міхаіл Кірылавіч, Вы — удзельнік вызвалення Беларусі. У якіх баявых аперацыях Вы прымалі непасрэдны ўдзел!**

— У вызваленні Беларусі я ўдзельнічаў у саставе 65-й арміі, фарсіраваў Сож, Днепр, Заходні Буг. Самае моцнае, што засталося ў памяці — гэта вызваленне каля 32 тысяч дзяцей, старых і жанчын з лагераў смерці ў раёне Парыч. Нямецкія полчышчы адступалі пад ударамі нашай арміі. З мэтай масавага распаўсюджання эпідэміі сыпнога тыфу яны прывезлі ў спецыяльных эшалонах з Гомельшчыны, Бабруйшчыны, Магілёўшчыны тысячы жанчын, дзяцей і старых, хворых сыпным тыфам і стварылі тры канцэнтрацыйныя лагеры. Адзін знаходзіўся на балоце ля пасёлка Дзерць, другі — у чатырох кіламетрах на паўночны захад ад Азарычаў у рэдкім сасновым лесе, трэці — на балоце ў двух кіламетрах ад вёскі Падасіннік. Гэтыя лагеры былі абнесены калючым дротам, замініраваны. Там не было ніякіх пабудоў. Тых, хто спрабаваў раскласці агонь, каб пагрэцца, расстрэльвалі. Людзі знаходзіліся на халоднай мёрзлай зямлі без усялякіх укрыццяў. Я не магу забыць гэтага жудаснага відовішча: дзеці, жанчыны, старыя штодзень паміралі сотнямі. Трупы памёршых ляжалі на балоце, іх ніхто не прыбіраў. Пры нашым наступленні фашысты не сталі знішчаць гэтыя лагеры. Яны хацелі іншага. Калі савецкія воіны ўбачаць гэтыя зверствы, кінуцца да замярзаючых людзей, і тады ў радах наступаючых пачнецца эпідэмія сыпнога тыфу. Такога ніколі нельга ні даравацЬ, ні забыць, асабліва зараз. Мне давялося ўдзельнічаць у ліквідацыі гэтых лагераў, у эвакуацыі людзей у шпіталі. Дваццаць пяць шпіталяў было аддадзена пад выратаванне гэтых людзей.

**Гутарку вяла А. ПЕКАР.**

● ФОТАЗАМАЛЁЎКА





**Любовь ЛЕВШУН, студентка филфака**

**ХАТЫНЬ**

I

Скорбь
скорбей воплотилась здесь!
Жизни,
смерти граница
здесь!
Путь в бессмертие —
началом здесь!
Белоруссии сердце
здесь...

II

«Все дороги
приводят в Рим!»
Поговорка стара
и лжет.
Я
не верю
дорогам таким,
По другим
моя жизнь идет.
В Белоруссии,
где полынь
слаще
памяти о войне,
все дороги
ведут в Хатынь!
Вот по ним
и скитаться мне...

● ЛЁСЫ ЛЮДСКІЯ

## САВЕЦКІ ЧАЛАВЕК

...ХЛОПЧЫК быў родам з невялікага нямецкага гарадка недалёка ад Дрэздэна. Калі вайна падыходзіла да канца, сям'я Клауса прабіралася з вёскі, дзе яна жыла некаторы час, дадому ў Дрэздэн. Нейкая сялянка, што ехала на кані, вырашыла дапамагчы сям'і: яна пасадзіла Клауса на свой воз. Да ночы вандроўнікі амаль выбіліся з сіл. Гізела нечакана страціла прытомнасць і ўпала на дарозе. Маці завіхалася ля дачкі. За гэты час падвода, на якой ехаў хлопчык, адышла далёка ўперад. Калі ў неразбярысе сялянка ўбачыла, што маці хлопчыка няма побач, яна зняла дзіця з воза і загадала чакаць. А маці, заўважыўшы, што сына няма побач, доўга шукала яго, але знайсці так і не змагла.

Пяць дзён скітаўся маленькі Клаус па дарогах. Няўтульна яго сустракалі пустыя дамы ў суседніх вёсках. Знямогшыся, хлопчык маленькім камячком застыў на дарозе, калі ля яго раптам рэзка затармазіла машына. Маёр Савецкай Арміі В. В. Зялёны падабраў хлопчыка і стараўся дапамагчы яму адшукаць бацькоў. Не знайшоўшы іх, пакінуў яго ў сваім батальёне. Хлопчык хутка акрыяў, прывязаўся да Віктара Васільевіча, навучыўся размаўляць па-руску.

Будучы ўпэўненым, што бацькі Клауса загінулі, Зялёны ўсынавіў нямецкага хлопчыка.

Віктар Васільевіч прайшоў доўгі баявы шлях. Гэты чалавек ваяваў пад Сталінградам, знаходзіўся ў гушчыні баявых дзеянняў на Курскай дузе, ваяваў пад Катавіцамі і Браслау. Затым будаваў пераправы на Одэры, Вісле, Нэйсе. Гэтыя масты не проста злучалі два супрацьлеглыя берагі. Гэта былі масты дружбы, масты да новага жыцця. У пасляваенны час прыёмны сын маёра Зялёнага Клаус-Валодзя вучыўся ў савецкай школе, уступіў у камсамол, пачаў працаваць на ўдарнай камсамольскай будоўлі. Ён быў і каменшчыкам, і зваршчыкам, брыгадзірам калектыву камуністычнай працы.

І вось — сустрэча праз гады. Былы ваенфельчар Надзея Булгакава, якая памятала выратаванага хлопчыка, напісала пісьмо ў «Комсомольскую правду», жадаючы даведацца пра далейшы лёс Клауса. Пісьмо перадрукавалі газеты ГДР. Родная маці, якая калісьці перажывала цяжкую разлуку, зараз перажывала радасць сустрэчы. Гэта сустрэча адбылася ў дні фестывалю моладзі ў Берліне. Так нямецкі хлопчык набыў дзве Радзімы — СССР і ГДР. Усё, што адбылося з Клаусам, глыбока сімвалічна, хвалюе да глыбіні душы. Калі Валодзю-Клауса запыталі, дзе яго Радзіма, ён адказаў: «Мая Радзіма — адна шостая частка зямлі».

Дваццаць тры гады я працую на падрыхтоўчым аддзяленні універсітэта. За гэтыя гады ў мяне было шмат студэнтаў з розных краін. Заўсёды з асаблівай увагай і хваляваннем яны слухаюць расказ аб вялікім подзвігу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Не прамінаю, каб расказаць і гэту гісторыю. Бачу, якое незвычайнае ўражанне аказвае мой расказ на юнакоў і дзяўчат з другіх краін, якія нярэдка вельмі мала ведаюць аб тым, што давялося перажыць нашаму народу ў гады вайны. Мы вырашылі напісаць пісьмо В. В. Зялёнаму. Выказаць яму вялікую ўдзячнасць за гэты глыбока чалавечны ўчынак.

**Л. САКАВЕЦ, старшы выкладчык падрыхтоўчага факультэта.**

## ● У НЕКАЛЬКІ РАДКОЎ

# ПРЫСВЕЧАНА ДНЮ ПЕРАМОГІ

● УРАЧЫСТЫ сход ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта адбыўся ў Палацы культуры чыгуначнікаў. Адкрыў сход сакратар парткома М. І. Дзямчук. Аб ваенна-патрыятычнай рабоце, якая праводзіцца ва універсітэце, расказаў рэктар, акадэмік АН БССР Л. І. Кісялеўскі. Потым выступілі старшыня Мінскай секцыі ветэранаў генерал-маёр В. І. Сінчылін, старшыня савета ветэранаў універсітэта І. В. Марчанка, прафесар А. А. Лойка, студэнт факультэта журналістыкі Зыонг Суан Шон.

У канцы ўрачыстага сходу адбыўся вялікі святочны канцэрт.

● СТАЛА традыцыяй штогод напярэдадні Дня Перамогі праводзіць сустрэчы былых партызан брыгады імя Варашылава са студэнтамі універсітэта. 7—9 мая зноў адбылася сустрэча ў Лаўскім лесе Уздзенскага раёна.

● ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ. Групай «Пошук» сабраны багаты матэрыял аб выкладчыках, студэнтах і супрацоўніках Мінскага юрыдычнага інстытута —удзельніках Вялікай Айчыннай вайны. Ва універсітэце ўстаноўлена мемарыяльная дошка Памяці выкладчыкаў, студэнтаў і супрацоўнікаў інстытута, загінуўшых у барацьбе з фашызмам. Зараз першы званок для першакурснікаў, як і апошні для пяцікурснікаў, суправаджаецца ўскладаннем вянкоў да мемарыялу.

● ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ. Адбылася сустрэча з былым сакратаром Мінскага падпольнага абкома партыі, Героем Савецкага Саюза Р. М. Мачульскім.

● ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ. Прайшоў вечар «Зорныя паходы па Беларусі — шлях у вялікі турызм». Аформлены стэнд «Салдаты міру».

● ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ. Праведзена канферэнцыя чытачоў па кнізе І. Новікава «Вызваленне Мінска».

ПРАЙШЛА канферэнцыя чытачоў па кнізе «Партызаны прымаюць бой» Героя Савецкага Саюза Намесніка Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Уладзіміра Елісеевіча Лабанка, прысвечаная 40-й гадавіне Полацка — Лепельскай бітвы.

«Кніга «Партызаны прымаюць бой». — шчыры роздум, які ідзе з глыбіні душы чалавека, шмат бачыўшага і ведаючага, выпрабаваўшага да дна горыч паражэння і радасць перамог, — адзначыў у сваім дакладзе І. В. Марчанка, старшыня савета ветэранаў універсітэта. — Кніга прысвечана доблесным народным мсціўцам, якія удзельнічалі ў барацьбе з ворагам не на жыццё, а на смерць». Аб подзвігу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны быў расказ І. Н. Вайняровіча, кінарэжысёра і франтавога аператара, народнага артыста БССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР і БССР, аўтара кінафільма «Балада аб мужнасці і каханні». Успамінамі аб гераічным мінулым падзялілася Кацярына Ільінічна Шырына, ветэран Вялікай Айчыннай вайны.

Далей слова даецца аўтару кнігі Герою Савецкага Саюза У. Е. Лабанку. Уладзімір Елісеевіч расказаў аб партызанскім руху ў Беларусі, аб вялікай мужнасці савецкіх людзей у час цяжкіх выпрабаванняў.

«Мы, маладое пакаленне, запэўняем вас, нашых настаўнікаў, людзей, якія сталі для нас самым яркім прыкладам, што мы ніколі не дазволім ворагам гаспадарыць на нашай зямлі», — з такімі словамі выступіла А. В. Вінічук, намеснік сакратара камітэта камсамола.

У заключэнні выступіў рэктар універсітэта акадэмік АН БССР Л. І. Кісялеўскі. Ён выказаў гасцям вялікую ўдзячнасць за іх цікавыя і змястоўныя расказы.

Канферэнцыя завяршылася дэманстрацыяй фільма «Балада аб мужнасці і каханні».

**А. МАТУСЕВІЧ.**

*Аляксандр БЕЛЬСКІ, студэнт філфака*

### У ПАРТЫЗАНСКАЙ ЗЯМЛЯНЦЫ

Заінелы абрус на сасновым
сталe,
Заінелы абрус за акном
на дварэ.
Холадна, зябка... Цяпла
не стае
У зямлянцы старой,
што сяброў не збярэ.

Ты не думай, прытулак
лясны партызан,
Што ў глушы ты адзін,
пазабыты даўно.
Недзе цепліцца памяць
людская табой
Замяці бела-ружовай на зло.

### ГРАНІЦА

Усюды пралегла граніца:
На сушы, у небе, на моры,
Каб вораг закляты не здолеў
У нашу краіну прабіцца.

Пакой наш парушыць,
і шчасце
Расцерці яму не ўдалося,
Каб весела людзям жылося,
Душа расчынялася насцеж.

Хай мірна гарацъ зараніцы,
Хай радасцю поўняцца
грудзі,
Сябрамі становяцца людзі,
А дружба—не мае граніцы!

## ● КАНФЕРЭНЦЫЯ ●



# ПОДЗВІГ, УВАСОБЛЕНЫ Ў ПОМНІКАХ

*«ГЕРАІЧНЫЯ падзеі Вялікай Айчыннай вайны ў помніках і абеліскаў Радзімы і іх роля ў ваенна-патрыятычным выхаванні» — пад такой назвай праходзіла ва ўніверсітэце навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 40-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Адкрыла канферэнцыю дэкан гістарычнага факультэта, доктар гістарычных навук, прафесар І. В. Царук. На пленарным пасяджэнні выступілі доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі КПСС В. К. Коршук, навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства Л. Г. Лапцевіч, старшыня савета ветэранаў універсітэта І. В. Марчанка.*

*На канферэнцыі працавала тры секцыі, на якіх было заслухана больш чым трыццаць дакладаў.*

*А. КАДУШЫНА.*

*НА ЗДЫМКУ: у час работы адной з секцый канферэнцыі.*

## ● ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА. ШТО ЗРОБЛЕНА?

# «ЗРУЧНАСЦІ... АДМЯНЯЮЦЦА»

ТАК НАЗЫВАЎСЯ крытычны матэрыял, змешчаны ў газеце ад 22 сакавіка 1984 года пад рубрыкай «Сатырычным пяром». Адказ на выступленне газеты даслаў дырэктар студгарадка універсітэта Я. М. Шабановіч:

**«Дырэкцыя студэнцкага гарадка, праверыўшы факты, выкладзеныя ў крытычным артыкуле «Зручнасці... адмяняюцца» паведамляе наступнае:**

**— факты недастатковага асвятлення кухонных пакояў на чацвёртым і пятым паверхах інтэрната № 4 мелі месца. Прычынай гэтага з'яўляюцца частае перагаранне лямпачак з-за іх нізкай якасці, а таксама нядбайныя адносіны студэнтаў да захавання грамадскай маёмасці. Устаноўлена, што пасля адбою студэнты на кухнях не выключаюць святло, гэта вымушаны рабіць швейцары інтэрната. Некаторыя студэнты (напрыклад, А. Бабкоў з 3 курса юрыдычнага факультэта), замест таго, каб скласці заяўкі электрыку, выкручваюць лямпачкі на кухні і зносяць іх у свае пакоі. У хуткім часе ў інтэрнаце № 4 у грамадскіх месцах будуць устаноўлены лямпы дзённага святла;**

**— фіранак для вокнаў, мэблі, рэпрадуктараў у інтэрнаце маецца ў дастатковай колькасці. Студэнты павінны самі атрымліваць іх у кастэляншы і каменданта. Настольных лямп у інтэрнаце няма;**

**— у інтэрнаце № 2 сапраўды мноства няспраўных кухонных ракавін. У сучасны момант замяніць іх няма магчымасці з-за адсутнасці на складах універсітэта;**

**— усе газавыя гарэлкі ў інтэрнаце № 2 спраўныя;**

**— затрымка абмену бялізны здарылася з-за хваробы кастэляншы С. А. Баркоўскай, якая адмовілася перадаць на час хваробы свае абавязкі;**

**— у адносінах да студэнтаў, якія выбілі шыбы ў інтэрнатах, калі выяўлена іх віна, прымяняюцца меры пакарання. Разбітыя шыбы заменены;**

**— дырэкцыя студэнцкага гарадка набыла два радыёвузлы з тым, каб размясціць іх у інтэрнатах № 2 і № 3. Заказаны радыёвузел для інтэрната № 4;**

**— прыняты меры адміністрацыйнага ўздзеяння у адносінах камендантаў інтэрнатаў № 2 А. Н. Нурметавай і № 4 Н. С. Седнярова. Ім зроблены заўвагі».**

# «ПАДАРУНАК ПРАЗ ФАРМУЛЯР?»

**ПАД ТАКОЙ назвай у газеце за 23 лютага гэтага года быў змешчаны фельетон, у якім крытыкаваліся некаторыя недобрасумленныя чытачы універсітэцкай бібліятэкі. Адказ на крытыку даслаў у рэдакцыю сакратар партбюро механіка-матэматычнага факультэта А. А. Кілбас:**

**«Факты, выкладзеныя ў фельетоне ў адносінах в. а. дацэнта кафедры тэарэтычнай механікі Н. П. Карэтка, пацвердзіліся. Парушэнне Н. П. Карэтка правілаў карыстання бібліятэчным абанементам было абмеркавана на пасяджэнні кафедры тэарэтычнай механікі 29 лютага і на пасяджэнні партбюро 1 сакавіка гэтага года. Улічваючы, што Н. П. Карэтка ліквідаваў запазычанасць і ўсвядоміў сваю віну, партбюро прыняло рашэнне абмежавацца яго папярэджаннем».**

**Як паведаміў сакратар партбюро гістарычнага факультэта Ю. Л. Казакоў, у адносінах студэнтаў Л. Малах, А. Сяргейчыка і супрацоўніцы Л. Л. Міхайлоўскай заўвагі былі прыняты партыйнай арганізацыяй да ведама. Гэтыя чытачы на сённяшні дзень з бібліятэкай разлічыліся.**

**Абыякава аднесліся да крытычнага матэрыялу на фізічным факультэце. Сакратар партбюро Л. М. Баркоўскі, што называецца «адмахнуўся» — накіраваў запатрабаванне рэдакцыі на рэагаванне у камсамольскую арганізацыю факультэта. Там, у сваю чаргу, А. Слабадзянюк, сакратар камітэта камсамола, перадаручыў «арганізацыю» адказу ў рэдакцыю камусьці са сваіх «падначаленых». І... справа лягла «пад сукно».**

**Магчыма, такія адносіны з боку кіраўніцтва партыйнай арганізацыі факультэта і спрыяюць іменна такой «зацікаўленасці» чытачоў, якія маюць запазычанасці, да бібліятэчных кніг, супраць якой выступіў фельетаніст.**

# ПАЦВЕРДЗІЛІ ТРЫВАЛЫЯ ВЕДЫ

НА БАЗЕ БДУ імя У. І. Леніна праводзіўся II (рэспубліканскі) тур алімпіяды па рускай мове «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» сярод замежных студэнтаў, што вучацца ў ВНУ нашай рэспублікі.

Удзельнікам алімпіяды былі прапанаваны тэмы пісьмовых работ. Большасць студэнтаў выбралі наступныя: «Ленін і сёння жывей за ўсіх жывых, нашы веды, сіла і зброя», «Дзеці розных народаў, мы мараю аб міры жывём», «Мой ідэал вучонага».

Пасля пісьмовага конкурсу студэнты прынялі ўдзел у гутарцы. Тут яны выявілі глыбокія веды ў пытаннях, звязаных з гісторыяй СССР, з дасягненнямі савецкага народа ў галіне культуры, навукі, літаратуры і мастацтва на сучасным этапе.

Па выніках пісьмовага і вуснага конкурсаў вызначыліся пераможцы алімпіяды. Залатымі, бронзавымі і сярэбранымі прызёрамі сталі студэнты нашага універсітэта. На першым месцы студэнтка 3 курса гістарычнага факультэта Янка Маронгава (ЧССР), на другім — трэцякурсніца біяфака Светла Іарданава (НРБ), і трэцяе месца — у студэнта 3 курса гістфака Рауфа Камкая з ДРА. На чацвёртым месцы студэнт 3 курса аўтатрактарнага факультэта БПІ Рамера Карлас Альберта з Калумбіі.

Усе чацвёра пераможцаў прымуць удзел у заключным (усесаюзным) туры алімпіяды, які адбудзецца ў Маскве.

**В. РАВІЦКІ,**
**загадчык кафедры рускай мовы па навучанню замежных студэнтаў асноўных факультэтаў, дацэнт.**


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

10 мая 1984 г.

АТ 10222 Зак. 792.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ